УДК 94(476):502.1“18/19”

# УСТАНАЎЛЕННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ АХОВЫ ДЗЯРЖАЎНЫХ ЛЯСОЎ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ (КАНЕЦ XIX – ПАЧАТАК XX ст.)

***І. В. Пугач,*** *старшы выкладчык кафедры ГБіСН, канд. гіст. навук,*
*БДПУ імя Максіма Танка*

*Рэзюмэ – на падставе супастаўлення паказчыкаў плошчы лясоў Віцебскай губерні, парушэнняў ляснога заканадаўства, даходнасці мясцовай лясной справы прадпрымаецца спроба ўстанаўлення эфектыўнасці захадаў урада па ахове дзяржаўных лясоў на яе тэрыторыі ў канцы XIX – пачатку XX ст.*

*Resume – based on a comparison of indicators of the area of forests in the Vitebsk province, violations of forest legislation, and the profitability of local forestry, an attempt is made to establish the effectiveness of government measures to forest protection on its territory in the late XIX$^{th}$ and early XX$^{th}$ cent.*

**Уводзіны.** Лясы адыгрывалі істотную ролю ў сацыяльна-эканамічным, экалагічным развіцці Віцебскага рэгіену ў канцы XIX – пачатку XX ст. У сувязі з гэтым важным прадстаўляецца ўстанаўленне эфектыўнасці аховы дзяржаўных лясоў Віцебскай губерні. Дасягненне адзначанай мэты бачыцца магчымым пры супастаўленні такіх паказчыкаў, як плошча лясоў губерні, колькасць і якасць парушэнняў ляснога заканадаўства, даходнасць мясцовай лясной справы ў XIX – пачатку XX ст.

**Асноўная частка.** У 1887 г. у Віцебскай губерні лясы пакрывалі плошчу ў 1 218 473 дзес. (31,9 % тэрыторыі губерні), з якіх толькі 152 939 дзес., ці 12,55 %, належалі казне, а ў 1907 г. – 982 тыс. дзес. (24 % тэрыторыі губерні) [1, с. 1–7, 10; 2]. Плошча казенных лясоў губерні ў 1892 г. складала 171 305,8 дзес., а ў 1907 г. – 165 893 дзес. [3; 4, с. 2–7]. Можна заўважыць значнае скарачэнне сярэдняй лясістасці губерні пры адначасовым нязначным ваганні плошчы казенных лясоў. Гэта можа тлумачыцца ўзмацненнем эксплуатацыі лясных багаццяў ва ўмовах развіцця капіталізму, асабліва ў прыватнаўласніцкіх гаспадарках, на якія не ў поўным аб’еме распаўсюджваліся лесазберагальныя захады ўрада.

У 1892 г. даходы ад казенных лясоў Віцебшчыны склалі суму ў 143 503 руб., а ў 1907 г. – 719 768 руб. Пры гэтым выдаткі на ўтрыманне лясной часткі склалі 74 148 руб. і 150 943 руб. адпаведна [4, с. 480–483; 5, с. 1]. Пададзенае сведчыць аб станоўчай даходнасці мясцовай дзяржаўнай лясной гаспадаркі ў адзначаны перыяд.

У разглядаемы перыяд парушэнні ляснога заканадаўства былі прадстаўлены самавольнымі высечкамі – 73 % ад усіх выпадкаў парушэнняў. Доля ўчынкаў, якія прыводзілі да пажараў, складала каля 4 %,

парушэнняў правілаў гаспадарання і безбілетнага сплаву лесаматэрыялаў – каля 1 %, іншыя тыпы парушэнняў (у асноўным несанкцыянаваны выпас жывелы) – каля 22 %. У цэлым у беларускіх губернях назіраецца павелічэнне колькасці выкрытых дзяржаўнай лясной адміністрацыяй альбо лясной вартай правапарушэнняў з 10 985 выпадкаў у 1892 г. да 25 283 у 1907 г., якія пераважна мелі дробны характар і не з'яўляліся галоўнай прычынай скарачэння лясоў у губерні. Гэтую акалічнасць можна інтэрпрэтаваць як вынік эфектыўнай дзейнасці мясцовага апарату па ахове казенных лясоў у адзначаны перыяд [4, с. 266–279; 6, с. 2–3].

**Заключэнне.** Такім чынам, адносная стабільнасць плошчаў дзяржаўных лясоў у Віцебскай губерні пры станоўчай даходнасці мясцовай лясной справы і росце выкрыцця парушэнняў ляснога заканадаўства дазваляюць канстатаваць эфектыўнасць комплексу захадаў урада па ахове дзяржаўных лясоў губерні ў канцы XIX – пачатку XX ст.

### ЛІТАРАТУРА

1. Главнейшие данные поземельной статистики по обследованию 1887 г. – СПб.: Издание Центрального статистического комитета Министерства внутренних дел, 1892. – Вып. 5: Витебская губерния. – 1898. – [2], 11, 19 с.

2. Приложение. Площадь лесов Европейской России по новейшим данным (1907 год) [Электронный ресурс] // Основы лесоохранения в России. Доклад Всероссийскому съезду лесовладельцев и лесохозяев для обсуждения лесоохранительного закона / М. М. Орлов. – Режим доступа: https://www.booksite.ru/fulltext/orl/ovo/sno/vy/2.htm#9. – Дата доступа: 19.04.2022.

3. Ведомость № 1 «О числе и площади лесных дач к 1 января 1893 года отдельно по губерниям, с распределением по роду владения и по назначению» // Отчет по лесному управлению Министерства государственных имуществ за 1892 год. Составлен V отделением Лесного департамента. – СПб.: Типография Морского министерства, 1893. – 1 с.

4. Приложение к отчету по лесному управлению за 1907 год // Отчет по лесному управлению за 1907 год. Составлен V отделением Лесного департамента. – СПб.: Типолитография Ю. Я. Римана, 1909. – 489 с.

5. Ведомость № 20 «О валовом доходе, расходе и чистом доходе, за 1892 год, отдельно по губерниям» // Отчет по лесному управлению Министерства государственных имуществ за 1892 год. Составлен V отделением Лесного департамента. – СПб.: Типография Морского министерства в главном Адмиралтействе, 1893. – 2 с.

6. Ведомость № 8 «О делах по нарушениям лесного устава за 1892 год, по губерниям» // Отчет по лесному управлению Министерства государственных имуществ за 1892 год. Составлен V отделением Лесного департамента. – СПб.: Типография Морского министерства в главном Адмиралтействе, 1893. – 5 с.